Источник: «Настаўніцкая газета» — 2022–05–07

Напярэдадні Дня Перамогі ў БНТУ ўшанавалі памяць герояў Вялікай Айчыннай вайны. Да ўрачыстага мерапрыемства далучыліся прадстаўнікі Міністэрства адукацыі.

# Святы абавязак

Месца правядзення акцыі выбрана невыпадкова: ля галоўнага корпуса БНТУ размешчаны помнік студэнтам і выкладчыкам Беларускага політэхнічнага інстытута, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Памяць аб іх подзвігу ў 1967 годзе была ўвекавечана ў мемарыяле. Дарэчы, помнік спраектаваны і пабудаваны навучэнцамі і супрацоўнікамі ўніверсітэта.

Міністр адукацыі Андрэй Іванец адзначыў, што гэтае месца ўвасабляе даніну памяці не толькі выкладчыкам і студэнтам політэхнічнага інстытута, якія не вярнуліся з фронту, але і ўсім героям, якія цаной свайго жыцця далі нам магчымасць жыць у незалежнай краіне. Ён падкрэсліў, што абавязак кожнага з нас — шанаваць памяць гэтых людзей.

Міністр адукацыі, прадстаўнікі міністэрства, супрацоўнікі і навучэнцы ўніверсітэта ўсклалі кветкі да помніка. Гэтая акцыя дала старт шэрагу мерапрыемстваў у БНТУ, прысвечаных Дню Перамогі. Адно з іх — Міжнародны лёгкаатлетычны студэнцкі прабег Іжэўск — Мінск. Прабегі Перамогі — традыцыя, якая зарадзілася ў Іжэўскім ДТУ яшчэ ў 70-х гадах. З 2003 года да ініцыятывы далучыўся БНТУ, і прабегі сталі міжнароднымі. Іх маршруты праходзяць па беларускіх і расійскіх дарогах, якія прывялі нашых дзядоў і прадзедаў да Вялікай Перамогі. На ўсім шляху ўдзельнікі наведваюць памятныя мясціны, ладзяць мітынгі-рэквіе-



мы, патрыятычныя акцыі. Сёлета ўдзельнікамі прабегу сталі студэнты Іжэўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя М.Ц.Калашнікава, Ніжагародскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Р.Я.Аляксеева і БНТУ.

**Дар'я РЭВА.**
**Фота аўтара.**

Дар'я Рэва. Святы абавязак